АДДЗЕЛ АДУКАЦЫІ ДОБРУШСКАГА РАЙВЫКАНКАМА
ДЗЯРЖАУНАЯ УСТАНОВА АДУКАЦЫІ «ЖГУНСКІ ДЗІЦЯЧЫ САД»

# “Экскурсія ў беларускую хату”

(для дзяцей дашкольнага ўзросту)

Аўтар
музычны кіраўнік
**Кавалёва С.В.**

**2011**

**Мэта:**

- знаёміць з інтэр'ерам сялянскай хаты;
- дапамагчы дзецям запомніць назвы і прызначэнне рэчаў, якімі карысталісь нашы продкі

***Экскурсію праводзяць тры дзяўчынкі, апранутыя ў беларускія нароныя касцюмы***

**1-ая дзяўчынка.** Добры дзень, праходзьце калі ласка.
**2-ая дзяучынка.** Запрашаем госці вас
**3-яя дзяўчынка.** У хату беларускую да нас.
**1-ая дзяўчынка.** Мы ўсе рэчы вам тут пакажам
І не толькі пакажам, ды яшчэ пра іх раскажам
**2-ая дзяўчынка.** Як нашы бабулі і дзядулі жылі
**3-яя дзяўчынка.** Ды як гэтымі рэчамі карысталіся яны.
**1-ая дзяўчынка.** Самая галоўная у хаце рэч – гэта печ
У ёй ежу гатавалі, і плечы саграваолі.
**2-ая дзяўчынка.** У гаршочках ежу гатавалі
**3-яя дзяўчынка.** І вось такімі гаршочкі з печы даставалі.
**1-ая дзяўчынка.** Каб вадзіцу ў ведрах было насіць лягчэй
Каромысла ладзілі да плячэй.
**2-ая дзяўчынка.** А вось гэта качарга
Попел з печы выграбае яна.
**3-яя дзяўчынка.** А гэта вось люлька –
У ёй калыхала дзіця матулька.
**1-ая дзяўчынка.** Паглядзіуе, якая прыгожая саматканая посцілка-
Дарожка для падлогі і для ложка.
**2-ая дзяўчынка.** Лапці бацька плёў із лыка
У іх скакала вельмі ліха.
**3-яя дзяўчынка.** А якая ж майстрыха была маці
Умела на кроснах рушнікі і абрусы ткаці.
**1-ая дзяўчынка.** Зімовымі вечарамі лямпу палілі
Пры ёй ткалі, вязалі, шылі.
**2-ая дзяўчынка.** А гэта – гліняны кубак ваду піць
Ды госця з дарогі напаіць.
**3-яя дзяўчынка.** А вось гэта – прас
Падобным бялізну прасуюць і ў наш час.
**1-ая дзяўчынка.** Ды толькі ў наш час, вугельчыкі ў прас не засыпаюць
А электрычаствам яго награваюць.
**2-ая дзяўчынка.** На куту вісяць абразы,
Ад бяды зберагаюць яны.
**3-яя дзяўчынка.** Падзівіцесь, якая прыгожая для вакна адзяванка
Называецца яна – выцінанка.
**1-ая дзяўчынка.** А гэта вось качолкі.
Імі рушнікі качалі і распрамлялі.
**2-ая дзяўчынка.** А маслабойкай масла збівалі бойка.
**3-яя дзяўчынка.** А гэта – скрыня

У яе хавала дабро гаспадыня.
**1-ая дзяўчынка.** Дзіўная машына – самапрадка
Кудзелю прадзе хутка ды гладка.
**2-ая дзяўчынка.** У ступе таўклі таўкачом
**3-яя дзяўчынка.** Хто ўмеў так рабіць, лічыўся лаўкачом.

**1-ая дзяўчынка.** А вось гэта называецца бёрда – грэбень
**2-ая дзяўчынка.** Пры ткацтве ён патрэбен.
**3-яя дзяўчынка.** А вось гэта ночвы –
Дзяцей купаць ды бялізну праць.
**1-ая дзяўчынка.** Вось такая наша беларуская хата
Дзіўнымі рэчамі багата.
**2-ая дзяўчынка.** Мы рады што вы зайшлі да нас
**3-яя дзяўчынка.** Дзякуем госці вас, ці спадабалася вам у нас?
**1-ая дзяўчынка.** Ну, тады да пабачэння,
Калі што не так, просім прабачэння.